**ЗАЎТРА, 1 сакавіка, ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ у Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.**

***Усе, як адзін, аддадзім свае галасы за кандыдатаў блоку камуністаў і беспартыйных!***

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна

№ 9 (354) | Субота, 28 лютага 1959 года | Цана 20 кап.

## УСЕ НА ВЫБАРЫ!

Раніцай у нядзелю 1 сакавіка гасцінна расчыняцца дзверы ўсіх выбарчых участкаў нашай рэспублікі.

Выбары ў гэтым годзе праходзяць у абстаноўцы вялікага творчага і працоўнага ўздыму, у абстаноўцы палітычнай актыўнасці працоўных мас, выкліканай гістарычнымі рашэннямі XXI з'езда КПСС.

У выніку няўхільнага і паслядоўнага правядзення ў жыццё палітыкі партыі і ажыццяўлення рашэнняў XXI з'езда КПСС у 1958 годзе дасягнуты вялікія поспехі ў развіцці ўсіх галін народнай гаспадаркі, навукі і культуры, ва ўздыме матэрыяльнага добрабыту народа.

Гэтыя поспехі сталі магчымымі толькі дзякуючы таму, што савецкая дэмакратыя адкрыла самыя шырокія і неабмежаваныя магчымасці для ўцягнення мас у будаўніцтва новага жыцця, для актыўнага ўдзелу ў кіраванні дзяржавай. Наша слаўная Камуністычная партыя ўдзяляе выключную ўвагу далейшаму паляпшэнню работы савецкіх органаў, павышэнню творчай актыўнасці і ініцыятывы працоўных мас, прыцягненню іх да шырокага ўдзелу ў кіраванні дзяржавай, ва ўсіх абласцях гаспадарчага, палітычнага і культурнага жыцця.

У напружанай і творчай рабоце савецкіх людзей, у іх вялікай актыўнасці—залог паспяховага выканання сямігодкі. У справу будаўніцтва камуністычнага грамадства, у справу выканання рашэнняў партыі і ўрада ўносіць уклад і калектыў нашага універсітэта. Наш уклад—гэта падрыхтаваныя маладыя спецыялісты, гэта шматлікія навуковыя работы і дапамога, аказаная нашымі вучонымі прамысловасці і сельскай гаспадарцы, навуковым і культурным установам, гэта, нарэшце, удасканальванне вучэбнага працэсу і ўсёй навуковай работы.

Некалькі сот вучоных і студэнтаў нашага універсітэта працуюць агітатарамі і на агітпунктах. Яны праводзяць вялікую і плённую работу. На агітпунктах чытаюцца лекцыі і даклады, дэманструюцца кінакарціны, выступаюць калектывы мастацкай самадзейнасці, праводзяцца юрыдычныя кансультацыі.

Нашы агітатары заклікаюць выбаршчыкаў аддаць свае галасы за кандыдатаў непарушнага блоку камуністаў і беспартыйных.

Таварышы навуковыя работнікі, студэнты, рабочыя і служачыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта!

Першага сакавіка аддадзім усе свае галасы за кандыдатаў непарушнага блоку камуністаў і беспартыйных, за кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР і мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных!

## Аддаем мы свае галасы

*За герояў Савецкага краю*
*Галасуем сёння мы зноў;*
*У Вярхоўны Савет выбіраем*
*Нашых слаўных дачок і*
*сыноў.*

*Каб на ніве калгаснай*
*шумелі*
*Залатой збажыны каласы,*
*За любімую партыю нашу*
*Аддаем мы свае галасы!*

*Каб свяцілі для шчасця*
*народа*
*Сямігодкі гіганцкай агні,*
*Каб раслі гарады і заводы,*
*Апускаем свае бюлетні!*

Мечыслаў ШАХЛОВІЧ,
студэнт III курса аддзялення журналістыкі завочнага факультэта.

## ЗА НАРОДНЫХ ВЫБРАННІКАЎ

1 сакавіка я буду першы раз у сваім жыцці ўдзельнічаць у выбарах, галасаваць за кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР лепшых сыноў і дачок нашай вялікай Радзімы—кандыдатаў блоку камуністаў і беспартыйных.

Удзел у выбарах з'яўляецца для мяне вялікім шчасцем. Я ганаруся тым, што з'яўляюся выбаршчыкам, што тым самым прамым удзел у кіраўніцтве нашай дзяржавай. За сваё шчасце, за права вучыцца аддам свой голас у дзень выбараў.

М. ВАСІЛЕНКА,
студэнт БДУ.




## Яна галасуе першы раз

—Нядаўна мне споўнілася 18 гадоў,—гаворыць студэнтка I курса матэматычнага факультэта Ала Барташэвіч.—Першы раз у сваім жыцці сёлета я падыйду да выбарчай урны, каб аддаць свой голас за народных выбраннікаў—кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР і мясцовыя Саветы.

Для Алы, як і для ўсіх юнакоў і дзяўчат нашай краіны, савецкая дзяржава адчыніла дзверы ў навуку.

Дзяўчына прышла ва універсітэт з Мінскай чыгуначнай школы № 26 з сярэбраным медалем.

Цяпер яна адказная за культурна-масавы сектар камсамольскага бюро курса. Сваю першую экзаменацыйную сесію Ала здала на выдатна.

—1 сакавіка, — гаворыць яна,—прагаласую за тое, каб яшчэ больш шчаслівы жыў наш народ.

В. ШЭІН.

## ПЕРШЫ УРОК

*Першы ўрок!.. Свой першы ўрок. Мусіць, толькі той, хто сам быў на нашым месцы, можа добра зразумець і ўявіць, якая гэта вялікая падзея ў жыцці маладога педагога.*

*Студэнты нашай групы праходзяць педагагічную практыку ў дваццатай школе Мінска. Нядаўна мы давалі ўрок у 5-ым класе гэтай школы. Мне давялося весці ўрок беларускай мовы па тэме «Прыметнікі якасныя, колькасныя і адносныя».*

*Колькі хвалявання і разам з тым радасці адчуваеш, калі ўпершыню заходзіш у клас. Ведаеш, што тут цябе чакае столькі цікавага, невядомага, новага. На цябе глядзяць дзесяткі пар дзіцячых вачэй, такіх даверлівых, пытлівых. Яны чакаюць ад цябе чагосьці, сочаць за кожным тваім рухам.*

*Што і гаварыць, хвалявалася я спачатку, нават вельмі «А што, калі можа зрабіць штонебудзь не так»,—увесь час лезла назойлівая думка. Але хутка хваляванне прайшло. Дзеці ўсе такія добрыя, уважлівыя. Ды і сябры, што сядзяць ззаду, падбадзёрваюць сваімі позіркамі: «Добра, Зіна, не хвалюйся.. Усё будзе добра». А самі, відаць, таксама перажываюць.*

*З якім хваляваннем чакалі мы ўсе вынікаў сваіх урокаў. Метадыст, завуч школы Пётр Фёдаравіч Карпека даў заўвагі і сказаў: «Я вельмі задаволены вашымі ўрокамі. Амаль усе яны былі метадычна правільнымі, вытрыманымі. Дзейнічайце так і далей».*

*Мой урок быў ацэнен на «выдатна». Такія ж адзнакі атрымалі Ніцеўская Анна, Лысенка Тамара.*

*Мы вельмі задаволены сваімі першымі ўрокамі. Толькі тут паспраўднаму адчуеш, якая ўсётакі цікавая праца педагога. І яшчэ мы ўсе ўдзячны нашаму выкладчыку беларускай мовы М. І. Жыркевічу за тое, што ён даў нам такія глыбокія веды па роднай мове.*

З. МАКАРЭВІЧ,
*студэнтка IV курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.*

